МІНІСТЭРСТВА
АДУКАЦЫІ
РЭСПУБЛІКІ
БЕЛАРУСЬ

Person und Gesellschaft

# ЧАЛАВЕК І ГРАМАДСТВА

1997

# ПРАГРАМЫ

## курса для сярэдніх агульнаадукацыйных школ і прафесійна-тэхнічных вучылішчаў

Curriculum für mittlere, ~~und~~ allgemeinbildende und Berufsschulen

BY
Z-4
(1,97)

МІНСК ♦ НМЦэнтр

Georg-Eckert-Institut BS78
1 234 041 3

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# ПРАГРАМЫ

курса для сярэдніх
агульнаадукацыйных школ
і прафесійна-тэхнічных вучылішчаў

# ЧАЛАВЕК І ГРАМАДСТВА

*Зацверджана*
*Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь*

НМЦентр
Выставочный
экземпляр

МІНСК
НМЦэнтр
1997

Праграма курса "Чалавек і грамадства" прадстаўлена ў двух варыянтах.

I варыянт праграмы распрацаваны аўтарскім калектывам: *Т. М. Бунтоўскай, І. І. Баградановічам, А. В. Данільчанка, С. В. Кузьміным, А. М. Лютым.*

II варыянт праграмы распрацаваны аўтарскім калектывам прафесара *Л. Н. Багалюбава.*

Georg-Eckert-Institut
für internationale
Schulbuchforschung
Braunschweig
-Schulbuchbibliothek -

98/808

BY
2-4
(1,97)

© Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь, 1997

# *І ВАРЫЯНТ*

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

**Мэта курса:** шляхам спасціжэння агульначалавечых каштоўнасцей садзейнічаць фарміраванню ў вучняў глыбокіх і ўсебаковых ведаў аб сацыяльным і духоўным свеце чалавека, яго жыццядзейнасці ў грамадстве, аб шляхах развіцця сучаснай цывілізацыі.

**Задачы курса:** 1. Сфарміраваць устойлівыя ўяўленні аб Сусвеце, месцы і ролі прыроды ў жыццядзейнасці чалавека і грамадства, аб чалавечай свядомасці, формах яе праяўлення, аб духоўным свеце чалавека; развіваць разуменне каштоўнасці і унікальнасці чалавечага жыцця і яго сэнсу.

2. Забяспечыць грамадазнаўчую падрыхтоўку, неабходную для свядомага выбару сацыяльнай пазіцыі, якая характарызуецца такімі якасцямі, як гуманізм, патрыятызм, інтэрнацыяналізм, грамадская актыўнасць, сацыяльная адказнасць.

3. Дапамагчы засвоіць галоўныя маральныя, палітычныя і прававыя прынцыпы, якія вызначаюць свядомыя адносіны чалавека да навакольнай рэчаіснасці, да іншых людзей і да самога сябе.

4. Арыентаваць вучняў на вышэйшыя агульначалавечыя каштоўнасці і ідэалы і выкарыстанне іх у якасці крытэрыяў ацэнкі прадметаў і з'яў рэчаіснасці.

5. Выпрацоўваць уменні і навыкі творчага мыслення, якія забяспечваюць магчымасць нестандартнага падыходу да вырашэння жыццёва важных для чалавека і грамадства праблем і задач.

У параўнанні з іншымі навучальнымі прадметамі курс "Чалавек і грамадства" мае больш абагульнены характар. Ён абапіраецца на веды, атрыманыя вучнямі пры вывучэнні іншых прадметаў. Канцэпцыя курса "Чалавек і грамадства" выяўляе прынцыпова новы падыход да стварэння школьнай грамадазнаўчай дысцыпліны. Яна поўнасцю адпавядае рэаліям сучаснага свету, накірунку і характару сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў у Рэспубліцы Беларусь. Яна прасякнута ідэяй гуманізацыі жыцця грамадства, прыяры-

тэту ў ім агульначалавечых каштоўнасцей і дэмакратызацыі ўсёй сістэмы грамадскіх адносін. Гэты курс павінен стаць адным з самых актыўных фактараў гуманізацыі школьнай адукацыі, бо ў ім на першы план вылучаецца чалавеказнаўства.

Выкладанне курса "Чалавек і грамадства" пачынаецца з азнаямлення з найбольш агульнымі светапогляднымі ўяўленнямі аб свеце і чалавеку, уключае ў сябе вывучэнне жыццядзейнасці чалавека ў розных сферах жыцця грамадства і заканчваецца цэласнай характарыстыкай сучаснага свету.

У кожным класе маецца на ўвазе вывучэнне аднаго з наступных раздзелаў курса "Чалавек і грамадства": VIII клас — "Свет і чалавек"; IX клас — "Свет чалавека"; X клас — "Чалавек у грамадстве"; XI клас — "Чалавек і сучасная цывілізацыя".

Праграма курса пабудавана наступным чынам: кожны раздзел падзелены на тэмы (з указаннем колькасці гадзін на іх вывучэнне); у тэме матэрыял падзелены на асобныя закончаныя часткі, кожная з якіх можа разглядацца як змест аднаго ўрока; у канцы раздзелаў выдзелены асноўныя паняцці і вядучыя ідэі; курс завяршаецца выніковымі занядкамі, даецца пералік асноўных уменняў і навыкаў, якімі неабходна авалодаць у працэсе вывучэння курса.

## *VIII КЛАС*

*1 гадзіна ў тыдзень*
*(усяго 34 гадзіны, з іх 30 гадзін па тэмах і 4 гадзіны, якія настаўнік вызначае самастойна)*

## СВЕТ І ЧАЛАВЕК

### УВОДЗІНЫ *(1 гадзіна)*

Чалавеказнаўства як сістэма навук аб чалавеку. Мэта, задачы і змест курса "Чалавек і грамадства" ў агульнаадукацыйнай школе.

### Тэма 1. РАЗВІЦЦЁ ЎЯЎЛЕННЯЎ АБ СВЕЦЕ І ЧАЛАВЕКУ *(3 гадзіны)*

Уяўленні старажытных людзей аб чалавеку і навакольным свеце. Міфалогія. Рэлігія. Адрозненне міфалогіі ад рэлігіі і рэлігіі ад навукі.

Уяўленне аб чалавеку і навакольным свеце вучоных розных часоў і народаў. Свет і чалавек у поглядах беларускіх

мысліцеляў і філосафаў (Францыск Скарына, Сымон Будны, Казімір Лышчынскі).

Сучасная навуковая карціна свету. Паняцце бясконцасці свету ў часе і бязмежнасці ў прасторы.

## Т э м а 2. ЧАЛАВЕК І ПРЫРОДА *(8 гадзін)*

Узнікненне жыцця на Зямлі: выпадковасць або заканамернасць. Наяўнасць іншых форм жыцця ў Сусвеце: гіпотэза або рэальнасць.

Прырода як майстэрня чалавека і як храм, у якім ён жыве. Прыгажосць і дасканаласць прыроды. Прырода і маральнасць.

Уздзеянне чалавека на прыроду. Рэальная небяспека экалагічнага крызісу. Экалагічнае становішча ў Беларусі і шляхі яго паляпшэння.

Чалавек як жывая істота. Адрозненне чалавека ад жывёліны. Магчымасці, патрэбнасці і здольнасці чалавека як біялагічнай істоты. Здароўе, самаадчуванне і вынослівасць чалавека. Чалавечыя якасці.

Прыродныя фактары ў жыцці чалавека. Надвор'е і самаадчуванне. Патрэбнасці чалавека ў кіслародзе, вадзе, цяпле. Штучны мікраклімат (адзенне, жыллё, бытавая тэхніка). Забруджванне навакольнага асяроддзя і хваробы чалавека.

Патрэбнасць у ежы і яе задавальненне. Голад і сытасць. Гурманы і аскеты, вегетарыянцы і мясаеды; пасты і галадоўкі. Рэжым харчавання сучаснага чалавека.

Прыродная стыхія і чалавек. Стыхійныя бедствы (землетрасенні, паводкі, засухі і інш.). Незвычайныя, загадкавыя з'явы прыроды і адносіны да іх чалавека. Паводзіны чалавека ў экстрэмальных сітуацыях.

Чалавек і жывая прырода. Гаспадарчае асваенне жывой прыроды чалавекам. Эвалюцыя разумных адносін чалавека да жывой прыроды (татэмізм, прамысловыя культы, адносіны рэлігіі да жывёл). Расліны і жывёлы ў жыцці чалавека.

## Т э м а 3. ЧАЛАВЕК ЯК ВЫНІК УЗАЕМАДЗЕЯННЯ ПРЫРОДЫ І ГРАМАДСТВА *(5 гадзін)*

Сацыяльная сутнасць чалавека. Суадносіны біялагічнага і сацыяльнага ў працэсе яго гістарычнага развіцця. Роля спадчыннасці і сацыяльнага асяроддзя ў станаўленні чалавека.

Развіццё прыродных задаткаў і здольнасцей чалавека ў працэсе яго жыццядзейнасці ў грамадстве. Неабходнасць гарманічнага развіцця ў чалавеку сацыяльных якасцей і фізічных уласцівасцей.

Чалавецтва, яго радавое адзінства і ўнутраныя адрозненні. Расы і народы. Гісторыя ўсведамлення чалавецтвам свайго адзінства. Расізм і нацыянальная выключнасць.

Чалавек як прадстаўнік розных біялагічных, этнічных і сацыяльных супольнасцей. Біясацыяльная разнастайнасць людзей як грамадскае багацце. Чалавек ва ўсіх вымярэннях.

Сутнасць прызначэння чалавека на Зямлі. Чалавек як мера ўсіх рэчаў і вышэйшая каштоўнасць. Фізічная і духоўная прыгажосць чалавека.

## Тэма 4. ЧАЛАВЕК І ЯГО ЖЫЦЦЁ *(5 гадзін)*

Самакаштоўнасць чалавечага жыцця, яго унікальнасць і непаўторнасць. Сэнс жыцця і яго мэта. Адносіны чалавека да жыцця і жыццёвая пазіцыя. Паняцце ладу жыцця. Чалавек як гаспадар свайго лёсу. Паўната і шчасце жыцця.

Этапы жыцця чалавека і іх узроставыя асаблівасці. Уяўленні розных народаў аб паўналецці; абрады ўступлення ў дарослае жыццё.

Сталасць і старасць. Сацыяльная роля і функцыі чалавека. Дарослыя і дзеці. Прыметы і прычыны старэння. Старасць і працаздольнасць. Доўгажыхары. Адносіны да старых у розных народаў у гісторыі чалавецтва.

Біялагічная і сацыяльная працягласць чалавечага жыцця. Смерць і бяссмерце. Тыпалогія прычын смертнасці. Пахавальныя звычаі і абрады. Адказнасць грамадства за жыццё кожнага чалавека і чалавека за сваё жыццё перад самім сабой.

Права на жыццё. Адносіны грамадства да добраахвотнага адыходу чалавека з жыцця. Недапушчальнасць замаху на чужое жыццё і нанясення яму шкоды. Марнатраўства жыцця і яго антыграмадскі, антычалавечы характар. Сучасныя сурагаты "шчаслівага" жыцця: наркаманія, п'янства.

## Тэма 5. ЧАЛАВЕК І ЯГО ДЗЕЙНАСЦЬ *(8 гадзін)*

Дзейнасць як спецыфічны чалавечы спосаб стаўлення да навакольнага свету. Вызначэнне дзейнай сутнасці чалавека праз задавальненне яго патрэбнасцей. Рэальныя і ўяўныя патрэбнасці і спосабы іх задавальнення. Спалучэнне патрэбнасцей чалавека з яго інтарэсамі і магчымасцямі.

Віды чалавечай дзейнасці і іх асаблівасці. Індывідуальная і калектыўная дзейнасць. Працоўная дзейнасць як аснова жыцця і развіцця чалавека, крыніца яго дабрабыту.

Навучальная дзейнасць як адзін з відаў працоўнай дзейнасці. Прафесійная дзейнасць. Асновы культуры разумовай і фізічнай дзейнасці.

Творчая дзейнасць і яе віды. Адрозненне творчай дзейнасці ад стэрэатыпнай, руціннай працы. Чалавек-творца і чалавек-робат. Творчы пачатак як аснова плённай і стваральнай дзейнасці чалавека.

Чалавек і свабода дзеянняў. Залежнасць дасягнення мэты і вынікаў дзейнасці ад умоў і сродкаў яе ажыццяўлення. Стваральная і разбуральная дзейнасць.

Сацыяльная актыўнасць і пасіўнасць чалавека ў грамадстве.

Сацыяльная адказнасць чалавека перад грамадствам і самім сабой за вынікі сваёй дзейнасці. Маральныя, прававыя, эстэтычныя і палітычныя нормы і прынцыпы, якія рэгулююць чалавечую дзейнасць.

Асноўныя ацэначныя характарыстыкі дзейнасці чалавека: дабро і зло, прыгажосць і пачварнасць, справядлівасць і несправядлівасць, прагрэсіўнасць і рэакцыйнасць; абавязак і воля як формы самарэгуляцыі чалавечых дзеянняў.

Дзейнасць і адпачынак, іх разумнае спалучэнне. Вольны час як сфера развіцця чалавечай асобы. Дзейнасць у вольны час і марнае правядзенне часу.

***Асноўныя паняцці.*** *Свет. Міфалогія. Рэлігійныя ўяўленні. Навуковая карціна свету. Прырода. Чалавек. Асяроддзе пражывання. Эвалюцыя. Экалогія. Экалагічны крызіс. Жывая прырода. Здароўе. Штучны мікраклімат. Экстрэмальная сітуацыя. Біялагічнае. Сацыяльнае. Спадчыннасць. Сацыяльнае асяроддзе. Прыродныя задаткі. Гарманічнае развіццё. Чалавецтва. Раса. Расізм. Народ. Нацыянальная выключнасць. Сэнс жыцця. Жыццёвая пазіцыя. Спосаб (лад) жыцця. Лёс. Шчасце. Смерць. Бессмяротнасць. Дзейнасць. Патрэбнасці. Інтарэсы. Праца. Культура дзейнасці. Творчая дзейнасць. Свабода. Сацыяльная актыўнасць. Прыстасавальніцтва. Дармаедства. Адказнасць. Дабро. Прыгажосць. Справядлівасць. Прагрэсіўнасць. Сумленне. Абавязак. Гонар. Адпачынак. Вольны час. Дзейнасць у вольны час.*

## Вядучыя ідэі

Чалавек — часцінка прыроды, якая не толькі залежыць ад яе, але і ўздзейнічае на яе. Грамадства — састаўная частка і вынік развіцця прыроды.

Чалавек — мера ўсіх рэчаў. Чалавечае жыццё — найвялікшая каштоўнасць, унікальная і непаўторная па сваёй сутнасці. Праз розныя віды дзейнасці чалавек выяўляе свае адносіны да навакольнага свету і нясе адказнасць перад грамадствам і самім сабой за іх вынікі.

## *IX КЛАС*

*1 гадзіна ў тыдзень*
*(усяго 34 гадзіны, з іх 30 гадзін па тэмах і 4 гадзіны, якія настаўнік вызначае самастойна)*

## СВЕТ ЧАЛАВЕКА

### Тэма 1. УНУТРАНЫ СВЕТ ЧАЛАВЕКА *(8 гадзін)*

Свядомасць як неабходная ўмова ўсіх форм жыццядзейнасці чалавека. Свядомасць, мозг, штучны інтэлект. Вышэйшыя формы псіхічнай дзейнасці чалавека — мысленне, памяць, воля, эмоцыі.

Свядомае і несвядомае. Свядомасць і мова. Тыпы мыслення. Законы лагічнага мыслення. Самасвядомасць і адносіны да іншага чалавека. Самааналіз і самаацэнка.

Свядомасць і пазнанне. Пазнанне чалавекам самога сябе і навакольнага свету. Формы пачуццёвага і рацыянальнага пазнання, іх узаемасувязь. Адчуванне і ўспрыманне. Пазнанне і практычная дзейнасць людзей. Пазнанне і ісціна. Веды і іх роля ў жыцці чалавека. Межы чалавечага пазнання.

Свядомасць і ацэнка. Рэальныя і ўяўныя каштоўнасці ў жыцці чалавека. Паняцце каштоўнаснай арыентацыі. Матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці. Маральныя і эстэтычныя каштоўнасці і ацэнкі.

Духоўны свет чалавека як адлюстраванне знешняга свету. Складанасць і індывідуальная своеасаблівасць духоўнага свету чалавека. Духоўнасць і бездухоўнасць, маральнасць і разбэшчанасць, формы іх праяўлення.

Пачуцці чалавека як праяўленне яго патрэбнасцей і інтарэсаў. Эмоцыі як непасрэдная ацэнка рэчаіснасці. Знешнія праяўленні эмоцый і пачуццяў. Тэмперамент. Культура пачуццяў і яе выхаванне.

Вышэйшыя чалавечыя пачуцці: абавязак, справядлівасць, каханне, дружба, таварыскасць, літасцівасць, высакароднасць, пачуццё прыгожага і інш. Нізкія чалавечыя пачуцці: зайздрасць, варожасць, сквапнасць, нянавісць, бессардэчнасць, бессаромнасць, безадказнасць, пачуццё брыдкага і інш. Эстэтычныя пачуцці і густы.

Мэты і ідэалы чалавека. Мэтазгодны характар усёй жыццядзейнасці чалавека. Ідэал як вышэйшая мэта. Рэчаіснасць і ідэал. Ідэал, мара, надзея, прагноз, фантазія. Ідэальнае і рэальнае ў чалавеку. Ідэал чалавека і сродкі яго дасягнення.

## Тэма 2. АСОБА І ЯЕ ФАРМІРАВАННЕ *(6 гадзін)*

Суадносіны паняццяў "чалавек", "індывід", "асоба". Роля сацыяльных умоў у фарміраванні асобы. Станаўленне і развіццё асобы ў працэсе грамадскага развіцця.

Асоба і яе сацыяльная роля ў грамадстве. Сацыяльны статус і сацыяльная пазіцыя асобы. Асноўныя характарыстыкі сацыяльнай пазіцыі асобы: гуманізм, сацыяльная актыўнасць, аптымізм, пераконанасць і т. п.

Сацыяльны прэстыж і прэтэнзіі асобы. Каштоўнасныя арыентацыі і перакананні сучаснага чалавека. Паняцце індывідуалізму і канфармізму. Маральныя асновы асобы.

Творчы патэнцыял асобы. Талент і асоба. Творчасць як вышэйшая форма праяўлення асобы. Выдатная асоба. Бязмежнасць творчых магчымасцей чалавека.

Усебаковае і гарманічнае развіццё асобы як гуманістычны ідэал. Выхаванне як асноўны метад фарміравання асобы. Адзінства інтэлектуальнага, духоўнага і фізічнага развіцця асобы.

Самавыхаванне ў жыцці чалавека. Пазнанне самога сябе. Індывідуальны лад жыцця. Уменне валодаць сабой. Метады і формы самаўдасканалення. Імкненне да ідэалу.

## Тэма 3. ЧАЛАВЕК СЯРОД ЛЮДЗЕЙ *(8 гадзін)*

Зносіны і іх роля ў жыцці чалавека. Зносіны як патрэбнасць, сродак і мэта. Традыцыйныя і новыя формы зносін. Фармальныя і нефармальныя, дзелавыя і сяброўскія зносіны. Мова як універсальны сродак чалавечых зносін.

Культура і майстэрства зносін. Інфармацыйныя і эмацыянальныя зносіны. Асаблівасці зносін людзей розных тыпаў. Правілы і нормы зносін. Красамоўства, міміка, жэсты. Просьбы, загады, спрэчкі.

Этыкет і манеры. Адзінства ўнутранай і знешняй культуры, павага да старэйшых, бацькоў, сяброў. Культура мовы, уменне валодаць эмоцыямі і пачуццямі.

Патрэбнасць чалавека ў чалавеку. Прычыны і формы кантактаў паміж двума або некалькімі людзьмі. Адносіны паміж суседзямі, знаёмымі і прыяцелямі. Узаемапавага, гасціннасць, сімпатыя і прыхільнасць. Таварыскасць і сяброўства як вышэйшыя формы праяўлення міжасобасных адносін. Маральныя прынцыпы таварыскасці і дружбы.

Міжасобасныя адносіны ў малых групах. Структура і класіфікацыя малых груп. Групы аднагодкаў і нефармальныя маладзёжныя аб'яднанні. Спецыфіка зносін у нефармальных групах. Праяўленні групавога насілля над чалавечай асобай і процiпраўныя дзеянні ў нефармальных групах і іх каральнасць.

Адносіны паміж юнаком і дзяўчынай. Супрацьлегласць полаў і вечныя каштоўнасці мужчынскага і жаночага характару. Мужнасць і жаноцкасць. Мужчынскі і жаночы гонар і годнасць. Маральныя нормы і правілы ва ўзаемаадносінах юнакоў і дзяўчат.

Уменне падабацца. Знаёмства, дружба, каханне. Маральны змест кахання. Каханне і закаханасць. Выбіральнасць кахання. Каханне і палавая прыхільнасць. Культура паводзін закаханых. Несумяшчальнасць сапраўднага кахання з разбэшчанасцю і непаважлівымі адносінамі да супрацьлеглага полу.

Інтымныя адносіны. Патрабавальнасць і адказнасць у каханні. Дашлюбныя сувязі і іх вынікі. Гатоўнасць да шлюбу: фізічная, грамадзянская і псіхалагічная сталасць. Эканамічная самастойнасць. Гатоўнасць да выканання гаспадарчых і выхаваўчых функцый у сям'і.

## Т э м а 4. ЧАЛАВЕК У СЯМ'І *(8 гадзін)*

Сям'я як першасная і абавязковая форма калектыўнай жыццядзейнасці людзей. Грамадскія функцыі сям'і: рэпрадуктыўная (узнаўленне чалавека), гаспадарча-эканамічная, арганізацыйная (арганізацыя вольнага часу і адпачынку), камунікатыўная і выхаваўчая.

Гістарычныя формы шлюбу і сям'і. Сям'я ў сучасным грамадстве і тэндэнцыі яе развіцця. Сямейна-шлюбныя адносіны і іх прававыя асновы. Супярэчлівасць сямейна-шлюбных адносін. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і. Парадак і ўмовы заключэння шлюбаў. Правы і абавязкі мужа і жонкі.

Маладая сям'я і праблемы фарміравання яе стылю і спосабу жыцця. Духоўны мікраклімат у сям'і: каханне і ўзаемапавага, такт і ўзаемаразуменне. Культура сямейных адносін. Праблема лідэрства ў сям'і. Роля мужчыны і жанчыны ў сям'і. Узаемаадносіны маладых мужа і жонкі з бацькамі і іншымі членамі сям'і.

Асновы сямейнай эканомікі. Бюджэт і гаспадарка маладой сям'і. Быт сям'і. Рацыянальнае размеркаванне хатніх абавязкаў паміж мужам і жонкай. Праблемы арганізацыі вольнага часу сям'і. Планаванне жыццядзейнасці сям'і.

Гармонія сямейна-шлюбных адносін. Псіхічная і псіхафізіялагічная сумяшчальнасць мужа і жонкі. Псіхалогія і псіхагігіена інтымных адносін у шлюбе. Культура інтымных адносін. Сексуальнае здароўе.

Дзеці ў сям'і. Псіхалагічныя праблемы мацярынства і бацькоўства. Правы і абавязкі бацькоў. Бацькоўская любоў і яе праяўленні. Абавязкі дзяцей у сям'і. Адносіны паміж

малодшымі і старэйшымі дзецьмі. Выхаванне і самавыхаванне ў сям'і.

Маральныя асновы сямейных адносін. Каханне як аснова сямейнага шчасця. Ідэальная сям'я і шчасце сямейнага жыцця. Сямейныя традыцыі і звычаі, духоўная пераемнасць пакаленняў, сямейны абавязак і гонар. Шлюбная няверпасць і яе вынікі: маральна-псіхалагічныя і фізічныя расстройствы. СНІД і яго маральна-прававыя праблемы. Рэлігія і сям'я.

Прычыны разводаў і іх вынікі. Шлюб скасаваны і шлюб несапраўдны. Рэўнасць. Развод эмацыянальны і развод фізічны. Адносіны паміж былымі мужам і жонкай, якія знаходзяцца ў разводзе. Родныя дзеці і чужыя сем'і. Праблемы адзіноцтва.

***Асноўныя паняцці.*** *Свядомасць. Мозг. Псіхічная дзейнасць. Мысленне. Памяць. Воля. Эмоцыі. Свядомае. Несвядомае. Самасвядомасць. Пазнанне. Практыка. Ісціна. Веды. Агульначалавечыя каштоўнасці. Духоўны свет. Духоўнасць. Маральнасць. Пачуцці. Тэмперамент. Дружба. Таварыскасць. Літасцівасць. Высакароднасць. Зайздрасць. Варожасць. Сквапнасць. Бессардэчнасць. Бессаромнасць. Безадказнасць. Мэта. Ідэал. Мара. Надзея. Прагноз. Фантазія. Асоба. Індывід. Індывідуальнасць. Сацыяльны статус. Сацыяльная пазіцыя. Гуманізм. Аптымізм. Сацыяльная актыўнасць. Пераконанасць. Сацыяльны прэстыж. Каштоўнасныя арыентацыі. Індывідуалізм. Творчасць. Талент. Самавыхаванне. Спосаб жыцця. Зносіны. Мова. Красамоўства. Этыкет. Манеры. Культура мовы. Павага. Сімпатыя. Прыхільнасць. Нефармальная група. Мужнасць. Жаноцкасць. Каханне. Закаханасць. Інтымныя адносіны. Сям'я. Шлюб. Муж і жонка. Сямейны мікраклімат. Сямейны бюджэт. Псіхалагічная сумяшчальнасць. Сексуальнае здароўе. Мацярынства. Бацькоўства. Дзеці. Выхаванне. Сямейнае шчасце. Шлюбная нявернасць. Рэўнасць. Развод. Адзіноцтва.*

### Вядучыя ідэі

Свядомасць як вышэйшая форма адлюстравання навакольнага свету з'яўляецца неабходнай умовай усіх форм жыццядзейнасці чалавека. Як грамадства фарміруе асобу, так і асоба ўздзейнічае на развіццё грамадства. Чалавекам нараджаюцца, асобай становяцца. Магчымасці ўдасканалення чалавечай асобы бязмежныя. Сумесная жыццядзейнасць людзей немагчыма без зносін. Каханне — вышэйшае чалавечае пачуццё ў адносінах мужчыны і жанчыны. Сям'я — першасная ячэйка грамадства. Гармонія сямейна-шлюбных адносін — аснова маральнага і фізічнага здароўя чалавека.

## *X КЛАС*

*1 гадзіна ў тыдзень*
*(усяго 34 гадзіны, з іх 30 гадзін па тэмах і 4 гадзіны, якія настаўнік вызначае самастойна)*

## ЧАЛАВЕК І ГРАМАДСТВА

### Тэма 1. ГРАМАДСТВА ЯК ЦЭЛАСНЫ САЦЫЯЛЬНЫ АРГАНІЗМ *(7 гадзін)*

Сферы грамадскага жыцця, іх узаемасувязь і ўдзел у іх чалавека. Вызначальны характар матэрыяльнага жыцця грамадства ў яго сацыяльным развіцці. Матэрыяльная вытворчасць і культура спажывання.

Чалавек у сістэме вытворчасці. Вытворчая дзейнасць чалавека як аснова паўнацэннага існавання грамадства. Таварная вытворчасць, яе сутнасць і асаблівасці. Падзел і спецыялізацыя працы. Сацыяльная справядлівасць і размеркавальныя адносіны. Стан эканомікі і ўзровень жыцця ў Рэспубліцы Беларусь.

Асновы сацыяльнага жыцця грамадства. Паняцце грамадскіх адносін. Чалавек у сістэме грамадскіх адносін. Сацыяльныя інстытуты. Сацыяльная сфера як неабходная ўмова грамадскага развіцця.

Палітычныя арганізацыі грамадства. Дзяржава і грамадства. Формы дзяржаўнага ладу. Федэрацыя. Аўтаномія. Суверэнная рэспубліка.

Палітычная свядомасць і палітычная дзейнасць. Палітычная сталасць. Палітычныя адносіны і палітычныя погляды. Новае палітычнае мысленне. Палітычная культура асобы.

Духоўнае жыццё грамадства. Духоўныя патрэбнасці, духоўныя зносіны і своеасаблівасць духоўных каштоўнасцей. Узаемасувязь духоўнага жыцця з іншымі сферамі жыццядзейнасці грамадства. Культура грамадства і культура асобы. Культура мас і масавая культура. Культурная спадчына і праблемы яе захавання ў Беларусі.

Адукацыя і яе месца ў духоўным жыцці грамадства. Адукацыя і выхаванне як неабходныя ўмовы патрэбнасці духоўных каштоўнасцей і творчай дзейнасці. Адукаванасць, інтэлігентнасць, культурнасць, выхаванасць як асноўныя характарыстыкі духоўна развітой асобы.

### Тэма 2. ЧАЛАВЕК І КАЛЕКТЫЎ *(8 гадзін)*

Калектыў як усеагульная сацыяльная форма аб'яднання людзей, звяно, якое звязвае чалавека і грамадства. Калек-

тыў, яго асаблівасці і адрозненні ад іншых аб'яднанняў людзей. Структура калектыву. Разнавіднасці калектываў у залежнасці ад відаў дзейнасці.

Калектывізм, эгаізм і індывідуалізм. Адносіны залежнасці і падпарадкаванасці. Лідэр і яго аўтарытэт у калектыве. Фармальныя і нефармальныя лідэры. Узаемадапамога і спаборніцтва, адказнасць і арганізаванасць у калектыве. Калектыўны эгаізм і яго праявы.

Вучэбны калектыў, яго задачы, функцыі і традыцыі. Унутрыкласныя і ўнутрышкольныя адносіны паміж вучнямі і паміж вучнямі і настаўнікамі. Правы і абавязкі вучняў. Праблемы вучэбнай і пазаўрочнай дзейнасці школьнага калектыву. Шляхі развіцця школьнага самакіравання.

Чалавек у працоўным калектыве. Працоўны калектыў прадпрыемства, яго функцыі, асаблівасці і структура, правы і абавязкі. Статут прадпрыемства. Кіраванне працоўным калектывам і самакіраванне. Шляхі папярэджання і пераадолення канфліктных сітуацый у працоўным калектыве. Прафсаюзы.

Асновы працоўнага заканадаўства. Колькасць і якасць працы. Парадак найму і вызвалення работнікаў.

Рабочы час і адпачынак. Аплата працы і яе асаблівасці для непаўналетніх. Прававыя, эканамічныя і арганізацыйныя асновы занятасці насельніцтва. Занятасць і сацыяльная абароненасць рабочых і служачых ад беспрацоўя.

Маральныя асновы жыцця працоўнага калектыву, фермера, арандатара, прадпрымальніка і прафесійная мараль. Захаванне працоўнай дысцыпліны, добрасумленныя адносіны да працы, кампетэнтнасць і адказнасць, павышэнне прафесійнага майстэрства. Прафесійны гонар, абавязак і гордасць. Нецярпімасць да безгаспадарчасці, разгільдзяйства, крадзяжу, прыпісак і г. д.

Эканамічная культура работніка і яе роля ў сучасных умовах. Развіццё пачуцця гаспадара і беражлівых адносін да прыватнай і калектыўнай уласнасці. Рэспубліка Беларусь ва ўмовах пераходу да рынанай эканомікі.

### Т э м а 3. ЧАЛАВЕК І ДЗЯРЖАВА *(9 гадзін)*

Паходжанне, сутнасць і формы дзяржавы. Прававая дзяржава, яе асаблівасці і функцыі. Асновы грамадскага ладу і палітыкі Рэспублікі Беларусь. Яе адміністрацыйна-тэрытарыяльная будова. Узаемаадносіны Рэспублікі Беларусь і іншых дзяржаў СНД. Прэзідэнт. Парламент, урад, суд. Супольніцтва "Беларусь — Расія". Мясцовае кіраванне і самакіраванне.

Дзяржава і ўлада. Новая рэдакцыя Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Прэзідэнт — кіраўнік дзяржавы. Прынцып раздзялення ўлад. Органы заканадаўчай улады Рэспублікі Беларусь.

Выканаўчая ўлада і яе органы. Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь. Мясцовыя органы ўлады.

Асновы канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь. Асноўныя канстытуцыйныя абавязкі, правы і свабоды яе грамадзян. Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека (ААН, 1948).

Прыналежнасць чалавека да пэўнага грамадства як аснова яго грамадзянскай пазіцыі. Чалавек — грамадзянін. Грамадзянства ў Рэспубліцы Беларусь. Грамадзянская сталасць. Патрыятызм — любоў да Айчыны. Грамадзянскі гонар, сумленне, абавязак, адказнасць, мужнасць як выяўленне адносін чалавека да грамадства, да сваёй дзяржавы.

Прававая абароненасць грамадзян дзяржавы. Права як рэгулятар грамадскіх адносін у розных сферах жыццядзейнасці грамадства. Галіны права: грамадзянскае, працоўнае, крымінальнае, адміністрацыйнае, сямейнае і інш.

Правапарушэнне — падстава для юрыдычнай адказнасці грамадзян. Прычыны і віды правапарушэнняў. Злачынства і пакаранне. Адказнасць непаўналетніх перад законам. Захаванне прынцыпаў сацыяльнай справядлівасці і роўнасці ўсіх перад законам. Стан злачыннасці і правапарушэнняў у Рэспубліцы Беларусь.

Неабходнасць умацавання законнасці ва ўсіх сферах грамадскага жыцця. Праваахоўныя органы: суд, пракуратура, органы юстыцыі, органы ўнутраных спраў, міліцыя, органы дзяржаўнай бяспекі.

Дзяржава і грамадскія арганізацыі. Шматпартыйная сістэма. Палітычныя партыі і грамадскія рухі ў Рэспубліцы Беларусь. Дзіцячыя і маладзёжныя грамадскія арганізацыі, рэлігійныя рухі і іх дзейнасць.

## Т э м а 4. ЧАЛАВЕК І ФОРМЫ ГРАМАДСКАЙ СВЯДОМАСЦІ *(6 гадзін)*

Філасофія і яе роля ў гісторыі чалавецтва. Матэрыялізм і ідэалізм у філасофскіх тэорыях. Агульначалавечыя каштоўнасці і ідэі гуманізму ў філасофіі. Шляхі развіцця філасофскай і грамадска-палітычнай думкі ў Беларусі. Філасофія і культура мыслення сучаснага чалавека.

Навука — рухаючая сіла прагрэсу. Класіфікацыя навук. Навуковае пазнанне як адзінства ведаў і дзейнасці. Навука як від духоўнай вытворчасці. Чалавеказнаўства як сукуп-

насць навук аб чалавеку. Навука і маральнасць. Прыярытэты развіцця навукі ў Рэспубліцы Беларусь. Дзейнасць Фонду фундаментальных даследаванняў.

Рэлігія — неад'емная частка культуры ўсяго чалавецтва. Сусветныя і нетрадыцыйныя рэлігіі. Спецыфіка рэлігійнай свядомасці. Суадносіны рэлігійнага і навуковага светапогляду. Рэлігія і агульначалавечыя каштоўнасці. Роля і месца рэлігіі ў сучасным грамадстве. Свабода сумлення. Сучасныя праблемы ўзаемаразумення і супрацоўніцтва веруючых, няверуючых і атэістаў у Рэспубліцы Беларусь.

Эстэтычная свядомасць у жыцці чалавека. Паняцце эстэтычнага пачуцця. Мастацтва як вяршыня эстэтычнай свядомасці і выяўлення эстэтычных адносін чалавека. Роля мастацтва ў фарміраванні і выхаванні асобы. Эстэтычная культура асобы. Беларускае нацыянальнае мастацтва і сусветная культура.

Маральная свядомасць у жыццядзейнасці чалавека. Гістарычныя тыпы маралі. Маральная культура асобы і яе фарміраванне ў сучасных умовах.

Права і прававая свядомасць. Гістарычныя формы права. Развіццё нацыянальнай прававой думкі: Статуты Вялікага княства Літоўскага, працы Францыска Скарыны, Льва Сапегі, Андрэя Волана і інш. Прававыя адносіны і прававыя погляды. Сутнасць права. Права і маральнасць. Фарміраванне прававой культуры асобы.

***Асноўныя паняцці.*** *Сацыяльная сфера. Вытворчая дзейнасць. Эканоміка. Сацыяльная справядлівасць. Дзяржаўны лад. Палітычная культура. Культура асобы. Культурная спадчына. Адукацыя. Адукаванасць. Інтэлігентнасць. Культурнасць. Выхаванасць. Калектыў. Аўтарытэт. Адказнасць. Вучэбны калектыў. Прафесійныя саюзы. Працоўнае заканадаўства. Рабочы час. Аплата працы. Занятасць. Беспрацоўе. Прафесійная мараль. Працоўная дысцыпліна. Прафесійны гонар. Крытыка. Уласнасць. Дзяржава. Прававая дзяржава. Грамадскі лад. Палітыка. Улада. Грамадская арганізацыя. Партыі. Саветы дэпутатаў. Прэзідэнт. Канстытуцыя. Дзяржаўная сімволіка. Грамадзянін. Грамадзянскасць. Канстытуцыйныя абавязкі, правы і свабоды грамадзян. Патрыятызм. Грамадзянства. Права. Прававая абароненасць. Правапарушэнне. Злачынства. Пакаранне. Законнасць. Філасофія. Навука. Рэлігія. Свабода сумлення. Эстэтыка. Мастацтва. Эстэтычная культура. Мараль. Маральная норма. Маральная культура. Прававая свядомасць. Прававыя адносіны. Прававая культура.*

## Вядучыя ідэі

Матэрыяльная вытворчасць — аснова ўсіх сфер жыццядзейнасці грамадства. Праз калектыў і пры дапамозе калектыву чалавек становіцца паўнапраўным членам грамадства. Кожны грамадзянін нясе адказнасць перад дзяржавай за выкананне сваіх грамадзянскіх абавязкаў, а дзяржава гарантуе яму абарону яго правоў і свабод. Чалавек праз авалоданне формамі грамадскай свядомасці спасцігае агульначалавечыя каштоўнасці і нормы, становіцца духоўна развітой асобай.

## *XI КЛАС*

*1 гадзіна ў тыдзень*
*(усяго 34 гадзіны, з іх 30 гадзін па тэмах і 4 гадзіны, якія настаўнік вызначае самастойна)*

# ЧАЛАВЕК І СУЧАСНАЯ ЦЫВІЛІЗАЦЫЯ

### Тэма 1. ГРАМАДСТВА І ЯГО РАЗВІЦЦЁ Ў ГІСТОРЫІ ЧАЛАВЕЦТВА *(4 гадзіны)*

Грамадства як сацыяльны арганізм, які развіваецца ў выніку гістарычнага ўзаемадзеяння людзей. Суадносіны грамадскага быцця і грамадскай свядомасці. Паняцце грамадскай вытворчасці і спосабу вытворчасці. Матэрыяльная і духоўная вытворчасць.

Сутнасць грамадскага прагрэсу. Вытокі і рухаючыя сілы грамадскага прагрэсу. Роля супярэчнасцей у грамадскім развіцці. Рэвалюцыйныя і эвалюцыйныя сацыяльныя змены. Шлях рэформ.

Адзінства і разнастайнасць сусветнай гісторыі. Уяўленне аб грамадстве ў розныя перыяды яго гісторыі. Фармацыя і цывілізацыя. Гістарычныя тыпы цывілізацыі. Дабро і зло ў гісторыі. Роля народных мас і асобы ў гісторыі. Змяненне месца чалавека ў свеце ў ходзе гістарычнага развіцця. Роля гістарычных асоб. Культ асобы як грамадская з'ява.

### Тэма 2. САЦЫЯЛЬНАЯ СТРУКТУРА СУЧАСНАГА ГРАМАДСТВА *(6 гадзін)*

Сацыяльная структура грамадства і сацыяльныя групы людзей. Фармальныя і нефармальныя, часовыя і пастаянныя, уяўныя і рэальныя супольнасці людзей, якія ўзнікаюць стыхійна і свядома. Роля грамадскага інтарэсу ў фарміраванні сацыяльнай структуры грамадства.

Сацыяльная псіхалогія і грамадская самасвядомасць. Уплыў прыналежнасці чалавека да той або іншай групы на яго індывідуальныя асаблівасці.

Дэмаграфічная і этнічная структура грамадства. Асноўныя дэмаграфічныя паняцці і працэсы: народанасельніцтва, нараджальнасць, смяротнасць, шлюбы, разводы, міграцыі і інш. Сучасныя асаблівасці дэмаграфічнай палітыкі. Дэмаграфічная сітуацыя ў Рэспубліцы Беларусь і яе перспектывы.

Нацыя як элемент сацыяльнай структуры грамадства. Нацыянальная культура і нацыянальны характар. Чалавек як прадстаўнік пэўнай сацыяльнай і нацыянальнай агульнасці. Узаемасувязь нацыянальнага і агульнанароднага.

Праблемы міжнацыянальных адносін у сучасных умовах. Патрыятызм, нацыяналізм, інтэрнацыяналізм. Гісторыя станаўлення і сучасныя праблемы беларускай нацыі.

Класы і класавыя адносіны ў грамадскім развіцці. Змяненне сацыяльна-класавай структуры грамадства ў яго гістарычным развіцці. Класавае і агульначалавечае ў сучасных умовах.

## Тэма 3. СУЧАСНЫ СВЕТ І САЦЫЯЛЬНЫ ПРАГРЭС
*(7 гадзін)*

Сутнасць сучаснага заходняга грамадства. Капіталізм і навукова-тэхнічны прагрэс. Асноўныя цэнтры сусветнай гаспадаркі.

Чалавек працы і праца ў сучасным капіталістычным грамадстве. Капіталізм і шляхі сацыяльнага прагрэсу чалавецтва.

Палітычная сістэма сучаснага заходняга грамадства. Віды палітычнага ладу заходніх краін. Улада і палітычныя партыі. Правы чалавека і палітыка правоў чалавека. Свабода, роўнасць і заходняя дэмакратыя.

Культура і асоба ў сучасным заходнім грамадстве. Форма сэнсу жыцця. Масавая і элітарная культура. Заходняе грамадства і праблемы гуманізацыі культуры.

Сутнасць сацыялістычнага ідэалу. Тэорыя і практыка пабудовы сацыялізму. Правы чалавека і правы нацый. Казарменны сацыялізм і палітыка знішчэння нацыянальнай культуры ў Беларусі.

Змяненне характару працы і вытворчых адносін у перыяд пераходу нашай краіны да рыначнай эканомікі.

Асноўныя напрамкі, мэты і задачы грамадска-палітычных і сацыяльных пераўтварэнняў у Рэспубліцы Беларусь.

## Т э м а 4. ЦЫВІЛІЗАЦЫІ І ГЛАБАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ СУЧАСНАСЦІ *(8 гадзін)*

Сацыяльна-эканамічная і палітычная разнастайнасць сучаснай цывілізацыі. Узаемасувязь і ўзаемазалежнасць сучаснага свету. Узрастанне ролі агульначалавечых пачаткаў у развіцці цывілізацыі. Асноўныя супярэчнасці сучаснай цывілізацыі, тэндэнцыі і перспектывы развіцця.

Чалавек і навукова-тэхнічны прагрэс. Цывілізацыі і НТП. Вытокі, сутнасць, характэрныя рысы і асноўныя напрамкі сучаснага этапа НТП. Адрозненне НТП ад навукова-тэхнічнай рэвалюцыі.

Сацыяльныя вынікі НТР і іх супярэчлівы характар. Маральныя аспекты НТП і перспектывы чалавецтва. Гуманістычны патэнцыял НТП.

Чалавек і глабальныя праблемы цывілізацыі, іх паходжанне і іерархія. Праблемы захавання міру на Зямлі і прычыны яе актуалізацыі ў сучасных умовах. Спецыфіка і характар міжнародных адносін і шляхі ўмацавання стабільнасці ў свеце. Узаемасувязь праблем вайны і міру з іншымі глабальнымі праблемамі сучаснасці. Уклад Рэспублікі Беларусь у вырашэнне праблемы міру.

Прычыны і шматграннасць сучасных экалагічных праблем. Ахова навакольнага асяроддзя. Безадходныя тэхналогіі. Рацыянальнае выкарыстанне сыравінных і энергетычных рэсурсаў.

Спецыфіка і асноўныя шляхі вырашэння экалагічных праблем на сучасным этапе. Экалогія і экалагічная свядомасць чалавека. Чарнобыльская катастрофа і экалагічныя праблемы Рэспублікі Беларусь.

Чалавек і дэмаграфічныя праблемы сучаснасці. Узнаўленне чалавечага жыцця і праблемы захавання чалавечага роду. Урбанізацыя і яе сацыяльна-дэмаграфічныя вынікі. Харчовая праблема і спецыфіка яе вырашэння ў розных краінах і рэгіёнах свету.

Цывілізацыя як сацыякультурнае ўтварэнне. Цывілізацыі і праблемы захавання чалавечай культуры. Культура і працэс гуманізацыі жыцця грамадства. Культура ва ўмовах узаемазвязанага, цэласнага свету і яе роля ў вырашэнні глабальных праблем выжывання чалавецтва.

## Т э м а 5. ГУМАНІСТЫЧНАЯ БУДОВА СВЕТУ І ЧАЛАВЕК *(5 гадзін)*

Сусветная культура і агульначалавечыя каштоўнасці як фундамент гуманістычнай будовы свету. Дэмакратызацыя культуры. Культурная і нацыянальная самабытнасць народа і агульначалавечыя каштоўнасці.

Ад нацыянальнага суверэнітэту да сусветнага згуртавання. Шляхі і перспектывы будаўніцтва агульнаеўрапейскага дома. Каштоўнасці сучаснай цывілізацыі і неабходнасць іх змянення ў працэсе стварэння гуманістычнага свету.

Сучасны гуманізм і яго характарыстыка: пачуццё глабальнасці, імкненне да справядлівасці, нецярпімасць да насілля. Усебаковае развіццё чалавека як вышэйшая мэта жыцця.

Сучасны чалавек і яго лепшыя якасці: любоў да бліжняга, вызваленне ад ілюзій, рэалістычнасць мыслення, глыбокае і ўсебаковае самапазнанне, паўната адчування адзінства з прыродай, саюз свабоды і справядлівасці.

Сацыяльная справядлівасць як асноўная мэта развіцця цывілізацыі. Асноўныя характарыстыкі гуманістычнай будовы свету: эканоміка на карысць чалавека, новая грамадская мараль, гуманныя адносіны да прыроды, чалавечая салідарнасць, шырокае супрацоўніцтва і ўзаемаразуменне людзей.

### *Падагульняючыя заняткі*

Чалавек і грамадства ў XXI стагоддзі.

***Асноўныя паняцці.*** *Грамадства. Грамадскае быццё. Грамадская свядомасць. Грамадская вытворчасць. Спосаб вытворчасці. Грамадскі прагрэс. Рэвалюцыя. Эвалюцыя. Рэформа. Фармацыя. Цывілізацыя. Культ асобы. Гістарычная неабходнасць. Сацыяльная структура. Сацыяльная група. Сацыяльная псіхалогія. Дэмаграфія. Народанасельніцтва. Нацыя. Нацыянальнасць. Народнасць. Нацыянальная культура. Нацыянальныя адносіны. Патрыятызм. Інтэрнацыяналізм. Нацыяналізм. Класы. Капіталізм. Сусветная гаспадарка. Масавая культура. Элітарная культура. Сацыялізм. Сацыялістычны ідэал. Рэгіянальныя канфлікты. Краіны, якія сталі на шлях развіцця. Навукова-тэхнічная рэвалюцыя. Глабальныя праблемы. Урбанізацыя. Харчовая праблема. Праблема выжывання чалавецтва. Гуманістычная будова свету. Сусветная супольнасць. Агульнаеўрапейскі дом. Сучасны гуманізм. Сучасны чалавек.*

### Вядучыя ідэі

Грамадства з'яўляецца унікальным па сваёй прыродзе сацыяльным арганізмам, які пастаянна развіваецца. Грамадства мае складаную сацыяльную структуру. Кожны чалавек заўсёды з'яўляецца прадстаўніком не толькі пэўнай нацыі або народа, але і унікальнай часцінкай усяго чалавецтва.

Сацыяльны прагрэс у сучасным свеце залежыць ад адзінства падыходаў усіх краін у вырашэнні агульначалавечых задач.

Сучасныя цывілізацыі — адно са звёнаў гісторыі чалавецтва. Чалавецтва імкнецца да гуманістычнай будовы свету. Сацыяльная справядлівасць — аснова сучаснага гуманізму.

## АСНОЎНЫЯ ЎМЕННІ І НАВЫКІ ВУЧНЯЎ

Выкарыстоўваць тэарэтычныя веды для аналізу і ацэнкі з'яў навакольнага свету;

правільна карыстацца ў сваёй жыццядзейнасці засвоенай тэрміналогіяй, аналізаваць розныя жыццёвыя сітуацыі, аб'ектыўна ацэньваць жыццёвыя імкненні і дасягнутыя вынікі тых, хто нас акружае, і свае ўласныя;

правільна будаваць свае адносіны з равеснікамі, настаўнікамі, бацькамі і знешнім акружэннем;

засвоіць асноўныя прынцыпы і маральныя нормы сямейных адносін;

аб'ектыўна меркаваць аб кожным чалавеку як аб асобе, яе духоўным патэнцыяле, маральных асновах і спосабе жыцця;

свабодна арыентавацца ў складаных сацыяльных працэсах, даваць аб'ектыўную ацэнку падзей і з'яў;

прымяняць атрыманыя сацыяльна-эканамічныя і прававыя веды ў штодзённай жыццядзейнасці;

арыентавацца ў сацыяльных прагнозах і тэндэнцыях развіцця сучаснага свету;

умець аналізаваць дзяржаўныя прававыя дакументы і законы;

весці дыскусію: выказваць уласнае меркаванне па пытанню, якое абмяркоўваецца, фармуляваць і абгрунтоўваць вывады і прапановы;

самастойна рыхтаваць дамашнія заданні, выкарыстоўваючы пры гэтым не толькі дадатковую літаратуру, але і перыядычныя выданні, радыё- і тэлеперадачы, кінафільмы і інш.;

рыхтаваць паведамленні па сацыяльна-палітычных і маральна-прававых пытаннях і выступаць з імі перад аднакласнікамі і малодшымі школьнікамі.

## II ВАРЫЯНТ

### ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Новы грамадазнаўчы прадмет "Чалавек і грамадства" ствараецца з улікам наступных палажэнняў:

1. Курс павінен садзейнічаць сацыялізацыі маладога пакалення, фарміраванню яго светапогляду, агульначалавечых каштоўнасных арыентацый.

2. Ён павінен стаць важнейшай састаўляючай працэсу гуманітарызацыі адукацыі; ідэя каштоўнасці чалавека і яго вольнага развіцця — асноўная для курса.

3. Курс павінен стварыць цэласную карціну сацыяльнага жыцця на аснове інтэграцыі ведаў з філасофіі, эканамічнай і сацыяльна-палітычнай тэорыі, этыкі, псіхалогіі, сацыяльнай псіхалогіі, сацыялогіі, паліталогіі і правазнаўства.

У аснову другой часткі гэтага курса пакладзены цывілізацыйны падыход да грамадска-гістарычнага развіцця, што патрабавала распрацоўкі новых крытэрыяў адбору зместу.

Дасягненні і праблемы сучаснага этапа цывілізацыйнага развіцця чалавецтва з'яўляюцца ядром зместу курса. Іх разгляданне ажыццяўляецца паслядоўна пры аналізе асноўных сфер жыццядзейнасці грамадства: эканамічнай, сацыяльнай, палітычнай, культурна-духоўнай. Значнае месца адводзіцца асноўным каштоўнасцям сучаснай цывілізацыі, якія ўключаюць у сябе сістэмы таварна-грашовага, рыначнага механізму рэгулявання эканамічных адносін; палітычныя адносіны, якія базіруюцца на прынцыпах прававой дзяржавы і грамадзянскага грамадства; агульначалавечыя маральныя каштоўнасці; прынцыпы міжнародных адносін, заснаваныя на новым палітычным мысленні; культурна-духоўныя каштоўнасці народаў і дзяржаў. З агульнацывілізаваных пазіцый разглядаюцца працэсы абнаўлення.

Глыбокаму ўспрыманню асаблівасцей сучаснай цывілізацыі дапаможа знаёмства з асноўнымі дасягненнямі перадавой грамадскай думкі, а таксама з галоўнымі вехамі развіцця чалавецтва на шляху станаўлення цяперашняга грамадства.

У першых раздзелах курса ўводзіцца ключавое паняцце "цывілізацыя". Спачатку яно разглядаецца ў гістарычным аспекце (яго трактоўка філасафамі эпохі Асветы, засна-

вальнікамі марксізму, заходнімі сацыёлагамі першай паловы XX ст.), а затым раскрываецца яго сутнасць з пазіцый сучаснай навукі ў супастаўленні з паняццем "грамадска-эканамічная фармацыя", якое ляжыць у аснове фармацыйнага падыходу. Заключныя сюжэты, аб'яднаныя тэмай "Шлях да новай цывілізацыі", заклікаюць надаць ведам і ўяўленням навучэнцаў значна большую паўнату і вядомую завершанасць.

Важным у змесце з'яўляецца імкненне на працягу ўсяго курса раскрыць гістарычны сэнс мінулых эпох і сучаснага этапа праз іх чалавечае вымярэнне. Менавіта цывілізацыйны падыход ставіць чалавека ў цэнтр вывучэння мінулага і цяперашняга. Гэты прынцып рэалізуецца і ў паслядоўным разглядзе духоўна-каштоўнасных арыентацый асобы і грамадства, якія вызначаюць самабытнасць цывілізацыі, і ў вывучэнні такіх пытанняў, як чалавек у сістэме эканамічных адносін, сацыяльны статус асобы, палітычны статус асобы, духоўнае жыццё сучаснага чалавека.

Айчыннае грамадазнаўства сёння імкліва асвойвае магчымасці выкарыстання цывілізацыйнага падыходу да вывучэння гістарычных сучасных сацыяльных працэсаў. Многія пытанні пакуль з'яўляюцца дыскусійнымі. Таму пры разглядзе шэрага праблем мэтазгодна прывесці аргументы прыхільнікаў розных, нярэдка і супрацьлеглых, пунктаў гледжання, прапанаваць навучэнцам самастойна вызначыць сваю пазіцыю ў гэтай спрэчцы, абгрунтаваўшы свой выбар.

## *VIII КЛАС*

*(34 гадзіны)*

### Раздзел I
### ЧАЛАВЕК, ПРЫРОДА, ГРАМАДСТВА

#### УВОДЗІНЫ

Гуманізм — прызнанне каштоўнасці чалавека. Гуманны чалавек і гуманнае грамадства. Гуманізм як прынцып адносін да навакольнай рэчаіснасці і паводзін чалавека.

Задачы, змест і метады вывучэння курса "Чалавек і грамадства".

#### Тэма 1. ШТО ТАКОЕ ЧАЛАВЕК

Рэлігійныя і навуковыя ўяўленні аб паходжанні чалавека. Прыродныя і сацыяльныя фактары станаўлення чалавека. Роля працы ва ўзнікненні і развіцці чалавека.

Адрозненне чалавека ад жывёл. Чалавек — істота біясацыяльная. Мысленне і мова — спецыфічныя ўласцівасці чалавека. Здольнасць чалавека да творчасці.

Магчымасці чалавека: фізічныя і інтэлектуальныя; скрытыя і рэалізаваныя. Выдатныя дасягненні людзей у розных галінах дзейнасці. Неабходнасць і спосабы пазнання сваіх магчымасцей.

Патрэбнасці чалавека: матэрыяльныя і духоўныя, сапраўдныя і ўяўныя. Інтарэсы чалавека, іх веданне і ўлічванне — умова гуманных адносін да людзей.

Здольнасці чалавека: ардынарныя і выдатныя. Талент, геніяльнасць — ступень развіцця здольнасцей. Сіла волі, яе значэнне і выхаванне. Характар — устойлівыя індывідуальныя асаблівасці чалавека. Фарміраванне характару і самавыхаванне.

Мараль, яе роля ў жыцці людзей. Змена ўяўленняў маралі на розных этапах развіцця грамадства. Простыя нормы маралі, "залатое правіла маральнасці".

Культура сапраўдная і ўяўная. Культура спажывання і культура творчасці. Прылучэнне да сусветнай культуры — неабходная ўмова чалавечага існавання.

Спрадвечнае імкненне людзей да пошуку адказу на пытанні: што ёсць сэнс жыцця, смерць і бессмяротнасць, шчасце? У чым заключаецца прызначэнне і адказнасць чалавека.

## Т э м а 2. ЧАЛАВЕК І ПРЫРОДА

Што такое прырода? Біясфера і ноасфера. Узаемадзеянне чалавека і навакольнага прыроднага асяроддзя.

Месца чалавека ў свеце прыроды. Развіццё ўяўленняў людзей аб эвалюцыі чалавека. Чалавек — звяно ў ланцугу эвалюцыі. Асаблівасці эвалюцыі чалавека. Пераход ад відавой эвалюцыі да развіцця грамадскіх адносін.

Уплыў гаспадарчай дзейнасці чалавека на навакольнае асяроддзе. Прагрэсіруючы працэс забруджвання прыроды. Экалагічныя крызісы ў мінулым чалавецтва. Асаблівасці сучаснага экалагічнага крызісу.

Ці ёсць межы росту гаспадарчай дзейнасці чалавека? Шляхі выхаду з экалагічнага крызісу.

Прырода — крыніца прыгожага. Прырода і маральнасць. Значэнне асабістага ўдзелу кожнага ў ахове навакольнага асяроддзя.

## Т э м а 3. ЧАЛАВЕК СЯРОД ЛЮДЗЕЙ

Агульная характарыстыка міжасобасных адносін. Адносіны дзелавыя і асабістыя. Сімпатыя і антыпатыя,

супрацоўніцтва і саперніцтва, узаемаразуменне ў міжасобасных адносінах.

Змест, форма і культура зносін. Асаблівасці зносін з аднагодкамі і дарослымі людзьмі. Канфліктныя сітуацыі і спосабы іх вырашэння. Культура дыскусіі.

Што такое малая група, віды малых груп па відах дзейнасці? Групы часовыя і пастаянныя. Самаадчуванне чалавека ў малой групе. Групавы эгаізм.

Калектыў і "псеўдакалектыў". Калектывізм, індывідуалізм і канфармізм. Свабода асобы і калектыў.

Таварыства і дружба як міжасобасныя адносіны. Юнацкі ідэал сябра. Несумяшчальнасць дружбы з эгаізмам, сябелюбствам і своекарыслівасцю.

Каханне — найскладанейшае чалавечае пачуццё. Каханне і іншыя пачуцці — інтарэс, закаханасць. Асаблівасці юнацкага кахання. Неабходнасць беражлівых адносін да дружбы і кахання.

Міжасобасныя адносіны ў сям'і. Сямейны абавязак, клопат аб членах сям'і. Сям'я як крыніца шчасця чалавека.

Месца і роля рэчаў у жыцці людзей. Культура адносін да рэчаў, якія створаны людзьмі. Культура адзення, быту, мастацкі густ.

Этыкет, яго роля ў зносінах паміж людзьмі. Ветлівасць, такт, прыстойнасць у паводзінах людзей. Значэнне самавыхавання ў фарміраванні культуры зносін і паводзін.

Юнацтва — перыяд актыўнага сацыяльнага пераходу ў дарослы сць. Пашырэнне сферы міжасобасных адносін у перыяд юнацтва. Мары і жыццёвыя планы. Рашэнне пытанняў: "Кім быць?" і "Якім быць?"

### Тэма 4. ЧАЛАВЕК У ГРАМАДСТВЕ

Паняцце аб грамадстве. Чалавек у эксплуататарскім грамадстве. Змяненне становішча чалавека ў грамадстве, свабодным ад эксплуатацыі, шлях да сапраўды гуманнага грамадства.

Эканамічная сфера жыцця грамадства: паняцце і асноўныя элементы. Тэхніка і тэхналогія. Навукова-тэхнічны прагрэс.

Эканоміка для чалавека. Чалавек у свеце эканамічных адносін. Што значыць "быць гаспадаром" сёння?

Класы і класавыя адносіны. Іншыя сацыяльныя групы і супольнасці. Грамадства — моладзі, моладзь — грамадству. Праблемы сацыяльнай роўнасці.

Нацыі і нацыянальныя адносіны. Лёс народа і лёс асобы. Адносіны да гістарычнага мінулага, традыцый, звычаяў народа. Праблемы міжнацыянальных адносін у сучасным

грамадстве. Клопат аб умацаванні дружбы народаў — абавязак кожнага.

Сям'я — з'ява гістарычная. Сувязь пакаленняў ці канфлікт пакаленняў? Сфера быту: праблемы і рашэнні.

Палітыка, яе роля ў жыцці грамадства. Палітычныя арганізацыі. Канстытуцыя Беларусі аб праве аб'яднання ў палітычныя партыі. Палітычныя дзеячы: якімі ім быць і як імі стаць?

Паходжанне і развіццё дзяржавы. Дзяржава, у якой мы жывём. Перспектыва стварэння прававой дзяржавы.

Права ў сістэме грамадскіх адносін. Абавязкі чалавека. Правы чалавека. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь аб правах, свабодах і абавязках асобы і грамадзяніна.

Маладзёжныя арганізацыі: задачы, асаблівасці пабудовы і дзейнасці. Удзел моладзі ў іншых самадзейных аб'яднаннях. Хто такія "нефармалы" ў маладзёжным асяроддзі.

Асноўныя рысы духоўнага жыцця грамадства. Каштоўнасці культуры і культура каштоўнасцей.

### ЗАКЛЮЧЭННЕ

Глабальныя праблемы сучаснага свету. Адносіны "Захад—Усход", "Поўнач—Поўдзень" у сучасным свеце. Праблемы свету і захавання чалавечай цывілізацыі. Перспектывы чалавецтва.

## *IX КЛАС*

*(34 гадзіны)*

## Раздзел II

## АСОБА. МАРАЛЬ. ПРАВА

### УВОДЗІНЫ

Задачы і змест курса "Асоба. Мараль. Права".

### Тэма 1. МАРАЛЬ: ЧАЛАВЕК — ВЫШЭЙШАЯ КАШТОЎНАСЦЬ

Мараль — навука пра дабро. Маральны ідэал. Самаўдасканаленне. Пошук маральнага ідэалу. Рэлігія і мараль. Атэізм і мараль.

Вялікія маральныя адкрыцці. Ідэі антычных мысліцеляў. Стары запавет: дзесяць запаведзяў. Евангелле: Нагорная пропаведзь Хрыста. Любоў і міласэрнасць — вышэйшае дабро жыцця, мэта жыцця. Чалавек — вышэйшая каштоў-

насць. Катэгарычны імператыў маралі. Разумнае самаабмежаванне.

Два бакі маралі. Мараль асобы і мараль грамадства. Ацэнка, рэгуляванне, выхаванне. Грамадская думка. Чалавек — не раб абставін. Унутраныя перакананні асобы. Выхаваўчая задача маралі.

Дабро і зло — асноўныя паняцці маралі. Паняцце дабра — выказванне імкнення да чалавечнасці, да гуманізму. Паняцце зла — выказванне ўяўленняў аб амаральнасці, антыгуманным, нядобрым. Крытэрый маральнага.

Мараль у нашым грамадстве. Рух наперад да агульначалавечых норм.

Суадносіны маральных і прававых норм.

Мараль і новае мысленне. Суадносіны агульначалавечых і класавых інтарэсаў у сусветнай палітыцы. Ад маралі "вобразу ворага" да маралі даверу і ўзаемаразумення.

## Тэма 2. МАРАЛЬНЫ СВЕТ АСОБЫ

Сэнс жыцця і шчасця чалавека. "Вялікія", "вечныя", "фатальныя" пытанні ў жыцці чалавека. Уяўленні аб сэнсе жыцця. Духоўнае выспяванне асобы і пошук маральнага ідэалу. Кім быць ці якім быць? Як разумець шчасце? Сувязь паміж шчасцем асобы і яе маральнымі паводзінамі. Эгаізм і альтруізм.

Абавязак і сумленне. Абавязкі чалавека перад грамадствам і перад самім сабой. Абавязак грамадскі і абавязак маральны (сумленне — аснова маралі, самакантроль асобы). Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь аб абавязках грамадзян. Чыстае сумленне, хворае сумленне, мукі сумлення.

Маральны выбар. Што такое добра і што такое дрэнна (маральная праблема). Як чалавек выбірае правільны ўчынак, правільную "лінію паводзін"? Свабода выбару і адказнасць. Маральны канфлікт — унутранае сутыкненне розных пазіцый. Чалавек сярод людзей. Добры ці злы чалавек па сваёй прыродзе. Маральныя асновы зносін. Зносіны і адзіноцтва. Таварыства і дружба. Здольнасць чалавека суперажываць і атаясамліваць сябе з іншымі. Бескарыслівасць і міласэрнасць — рысы гуманных паводзін.

Маральныя аспекты кахання і шлюбу. Каханне і ідэал. Духоўны саюз у каханні. Маральныя асновы шлюбу і сям'і. Маральны абавязак, гонар і годнасць у сямейным жыцці. Праблема сапраўднага раўнапраўя мужчыны і жанчыны. Адносіны да жанчыны — паказчык маральнай культуры.

## Т э м а 3. МАРАЛЬНАЯ КУЛЬТУРА АСОБЫ

Сутнасць маральнай культуры. Чалавек — творца самога сябе. Маральныя веды і практычныя паводзіны асобы. Крытычны аналіз уласных намераў і ўчынкаў. Спалучэнне асабістых інтарэсаў з інтарэсамі іншых. Чуласць і паслядоўнасць у адстойванні справядлівасці. Бясконцасць працэсу маральнага ўдасканальвання.

Маральная актыўнасць асобы ва ўмовах галоснасці і дэмакратыі. Неабходнасць выхавання сацыяльна адказных паводзін. Развіццё пачуцця асабістай годнасці, павагі да іншага чалавека, цярпімасці. Фарміраванне "культуры нязгоднасці" ва ўмовах плюралізму думак.

Этыкет — абагульненне маральнага вопыту папярэдніх пакаленняў. Дэмакратычнасць этыкету ў сучасным грамадстве. Накіраванасць этыкету на гарманізацыю міжасобасных адносін.

Ці заўсёды маральны чалавек ветлівы? Культура ўнутраная і знешняя. Развіццё матываў, якімі кіруюцца людзі ў працэсе адносін. Супярэчнасці паміж мараллю і этыкетам. Крывадушнасць і ханжаства. Шчырасць і добразычлівасць — гуманістычныя каштоўнасці этыкету.

## Т э м а 4. ПРАВА: МЕРА СВАБОДЫ І АДКАЗНАСЦІ АСОБЫ

Уводны занятак. Чалавек мае права. Правы чалавека.

Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека — асноватворны прававы дакумент сучаснасці. Асноўныя ідэі Дэкларацыі. Значэнне Дэкларацыі як ідэалу права, да ажыццяўлення якога павінны імкнуцца ўсе народы і ўсе дзяржавы. Ідэі Дэкларацыі ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Мера свабоды асобы. Асоба і грамадзянін. Прывілеі і правы. Ад класавага да агульначалавечага. Сутнасць дзяржавы і права. Сістэма права. Ідэя злучэння сілы і права. Жыць па справядлівасці. З гісторыі прававых ідэй. Вялікія мысліцелі мінулага аб прававой дзяржаўнасці. Катэгарычны імператыў права.

Ідэя прававой дзяржавы: права вышэй за ўладу. Дзяржава — гэта ўлада. Дзяржаўныя органы ў Рэспубліцы Беларусь. Сутнасць прававой дзяржавы. Асноўныя прыметы прававой дзяржавы. Рэалізацыя ідэі прававой дзяржавы ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Прававое становішча грамадзяніна. Роўнасць грамадзян перад законам. Паўналецце. Асноўныя правы, свабоды і абавязкі грамадзян, магчымасці іх рэалізацыі. Адказнасць грамадзян перад дзяржавай.

### Т э м а 5. НА ШЛЯХУ ДА ПРАВАВОЙ ДЗЯРЖАВЫ

Чалавек у прававо дзяржаве. Інтарэсы, правы і свабода асобы — вышэйшая каштоўнасць прававой дзяржавы. Гарантыі правоў і свабод асобы. Спалучэнне грамадскага і асабістага інтарэсу ў грамадзяніна, яго правоў і абавязкаў. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь аб асобе, грамадстве і праве.

### Т э м а 6. ПРАВАВАЯ КУЛЬТУРА АСОБЫ

Сутнасць прававой культуры. Прававая культура — важны рэгулятар паводзін асобы. Глыбокая павага права — аснова прававой культуры. Прававыя веды чалавека і ўменне выбіраць тое ці іншае рашэнне, пэўную форму практычных паводзін. Уплыў прававой культуры на ажыццяўленне правоў і свабод асобы. Роля адвакатуры і юрыдычных кансультацый для грамадзян.

Дэфармацыі ў развіцці маральна-прававой культуры асобы. Скажэнне ўяўленняў аб справядлівым і належным. Праявы маральнай адаптацыі (маральнай цярплівасці) да парушэнняў правоў асобы. Прававы нігілізм.

Роля прававой культуры службовых асоб і работнікаў праваахоўных органаў у забеспячэнні і абароне правоў асобы.

Адраджэнне маральна-прававой культуры асобы. Ідэал прававога, дэмакратычнага грамадства, агульначалавечыя каштоўнасці маралі і права — апора і арыенцір удасканалення маральна-прававой культуры грамадства і асобы. Неабходнасць пераадолення праяў маральна-прававога нігілізму, фарміравання паважлівых адносін да маралі, права і закону. Ператварэнне патрабаванняў маралі і права ў звычку і жыццёвую патрэбнасць.

### Т э м а 7. УЗАЕМАДЗЕЯННЕ МАРАЛІ І ПРАВА

Мараль і права: што іх збліжае і ў чым іх адрозненне. Чалавек — вышэйшая каштоўнасць маралі і права. Справядлівасць — агульная аснова маралі і права. Усеагульны характар дзеяння маралі, абмежаванасць сферы дзеяння права. Адрозненні паміж маральнай і прававой адказнасцю асобы.

Адраджэнне маральных і прававых пачаткаў у жыцці грамадства. Уздзеянне маралі на развіццё права. Роля права ў сцвярджэнні і абароне маралі. Узмацненне маральных і прававых гарантый абароненасці чалавека.

### ЗАКЛЮЧЭННЕ

Роля маралі і права ў станаўленні чалавека і грамадзяніна.

## *X КЛАС*
## *(34 гадзіны)*

## Раздзел I
## НА ШЛЯХУ ДА СУЧАСНАЙ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ

### Тэма 1. МЫСЛІЦЕЛІ МІНУЛАГА І СУЧАСНАСЦІ АБ ГРАМАДСТВЕ І ЯГО РАЗВІЦЦІ

### Грамадства і грамадскія адносіны

Паняцце грамадства. Узаемасувязь грамадства і прыроды. Грамадства як сістэма. Сферы грамадскага жыцця і іх узаемадзеянне. Грамадства ў развіцці. Прагрэс і яго крытэрыі. Асаблівасці пазнавання грамадскіх з'яў.

***Асноўныя паняцці.*** *Грамадства. Сферы грамадскага жыцця. Грамадскі прагрэс. Грамадскія адносіны.*

### Развіццё ведаў аб грамадстве

Уяўленні аб грамадстве на ўзроўні міфалагічнай свядомасці. Погляды Платона і Арыстоцеля на грамадства. Тэорыя грамадскага дагавора. Французскія філосафы-асветнікі аб цывілізацыі. А. Сміт аб ролі працы ва ўстанаўленні грамадскіх сувязей. Сацыялісты-утапісты аб ідэальнай грамадскай будове. Ідэя грамадзянскага грамадства і яе развіццё ў працах Гегеля. Гегелеўская дыялектыка і сусветна-гістарычны працэс. Станаўленне сацыялогіі як навукі. Перадумовы ўзнікнення марксізму. Камуністычная ідэя ў кантэксце сусветнай цывілізацыі. Марксізм як тэорыя і ідэалогія.

***Асноўныя паняцці.*** *Дзяржава. Грамадскі дагавор. Грамадскі ідэал. Грамадзянскае грамадства. Дыялектычны метад. Сацыялогія як навука.*

### Развіццё грамадазнаўства ў XX стагоддзі

Ідэі тэхнакратызму ў сацыяльным пазнанні. Сучасны "неадарвінізм". Духоўныя каштоўнасці і іх роля ў жыцці грамадства. Праблемы сутнасці і існавання чалавека ў філасофіі экзістэнцыялізму. Сутнасць тэорый сацыяльнай стратыфікацыі. Навуковая распрацоўка паняццяў "сацыяльная роля" і "сацыяльны статус". Праблема перыядызацыі гістарычнага развіцця. Гісторыя скрозь прызму цывілізацыйнага падыходу.

***Асноўныя паняцці.*** *Прагрэс. Тэхнакратызм. Неадарвінізм. Культура. Духоўныя каштоўнасці. Свабода асобы. Сацыяльныя групы. Сацыяльная роля. Сацыяльны статус. Этапы прагрэсу.*

### Праблемы сучаснага грамадазнаўства

Сучасны этап развіцця грамадскіх навук. Узрастанне ролі навуковых дыскусій. Абмеркаванне пытанняў маральнага ўдасканалення асобы ва ўмовах перабудовы. Дыскусіі па праблемах моладзі і маладзёжнай палітыкі.

***Асноўныя паняцці.*** *Ідэалогія. Грамадскія навукі. Мараль. Культурныя каштоўнасці. Маладзёжная культура.*

## Тэма 2. ЦЫВІЛІЗАЦЫІ МІНУЛАГА

### Што такое цывілізацыя?

Суадносіны паняццяў "фармацыя" і "цывілізацыя". Прыметы цывілізацыі. Цывілізацыя і культура. Агульначалавечыя каштоўнасці.

***Асноўныя паняцці.*** *Грамадска-эканамічная фармацыя. Цывілізацыя. Спосаб жыцця. Сацыяльныя каштоўнасці. Цывілізацыйны падыход да гістарычнага працэсу.*

### Асаблівасці старажытных цывілізацый

Пераход ад дакласавага, дапісьменнага, дадзяржаўнага і дагарадскога стану грамадства да цывілізацыі. Змяненне ўзаемадзеяння чалавека і прыроды. Станаўленне грамадзянскага грамадства старажытнасці. Уклад народаў свету ў дасягненні цывілізацыі старажытнасці. Адзінства і ўзаемасувязь свету старажытных цывілізацый. Праблема сучаснага разумення старажытнасці.

***Асноўныя паняцці.*** *Старажытныя цывілізацыі. Грамадзянскае грамадства старажытнасці. Сусветныя рэлігіі.*

### Старажытныя цывілізацыі Еўропы

Спецыфічныя асаблівасці старажытнагрэчаскай цывілізацыі: класічнае рабства; поліс як адзінства палітычнай структуры і грамадзянскага грамадства. Вялікія дасягненні старажытнагрэчаскай культуры. Зараджэнне філасофіі. Цывілізацыя элінізму — своеасаблівы сінтэз усходніх і ан-

тычных элементаў грамадства. Грамадзянскія каштоўнасці Рыма. Рымскае права. Рымскае красамоўства.

***Асноўныя паняцці.*** *Поліс. Грамадзянскія каштоўнасці. Эліністычная манархія. Матэрыялізм і ідэалізм. Дыялектыка. Алігархія. Дэмакратыя. Рымскае права.*

**Свет варварства**

Натуральная гаспадарка і яе роля ў жыцці варварства. Супярэчнасць паміж дэмакратычнымі радавымі структурамі і ўзвышэннем знаці. Мілітарызацыя грамадскага жыцця. Знаць і дружыннае асяроддзе — крыніца воінскай ідэалогіі. Каштоўнасці свету варвараў, іх адзінства і супярэчнасці. Сутыкненне варварскага і антычнага грамадстваў.

***Асноўныя паняцці.*** *Варвары. Ваенная дэмакратыя. Натуральная гаспадарка. Дружыннае асяроддзе. Радавыя каштоўнасці. Гераічныя каштоўнасці.*

**Еўрапейская цывілізацыя эпохі сярэднявечча**

Феадалізм як спосаб жыцця і мыслення. Саслоўі сярэдневяковага грамадства, характарыстыка іх каштоўнасцей. Сувязі саслоўяў і непераадольныя псіхалагічныя бар'еры паміж імі. Манархія і царква як гаранты стабільнасці сярэдневяковага грамадства. Хрысціянства як аснова сярэдневяковай цывілізацыі. Горад — калыска новай цывілізацыі.

***Асноўныя паняцці.*** *Феадалізм. Сялянства. Рыцарства. Рыцарскія каштоўнасці. Манархія. Царква. Хрысціянства. Цэх. Камуна.*

**Пераход да індустрыяльнай цывілізацыі**

Перадумовы паскарэння грамадскага прагрэсу ў Еўропе. Першапачатковае назапашванне капіталу і фарміраванне эканамічнага суверэнітэту ўласнікаў. Каштоўнасці эпохі Адраджэння: гуманізм, свабода асобы. Злом духоўнага адзінаўладдзя царквы ў ходзе Рэфармацыі. Дабрадзеі ранняга капіталізму: гаспадарлівасць, беражлівасць, памяркоўнасць. Зараджэнне і развіццё парламентарызму. Значэнне прамысловага перавароту і буржуазных рэвалюцый у пераходзе да індустрыяльнай цывілізацыі.

***Асноўныя паняцці.*** *Першапачатковае назапашванне. Гуманізм. Гаспадарлівасць. Беражлівасць. Памяркоўнасць. Парламентарызм. Рэфармацыя. Прамысловы пераварот.*

### Цывілізацыі Усходу

"Няспыннасць" развіцця. Непарыўная сувязь усходняй цывілізацыі з прыродай. Традыцыйнасць як вызначальны момант жыцця. Асаблівасці ва ўспрыманні рэлігіі. Адсутнасць свабоды і дэмакратыі ў еўрапейскім разуменні. Своеасаблівасць сацыяльнай псіхалогіі Кітая, Індыі, Японіі.

***Асноўныя паняцці.*** *Традыцыя. Традыцыйнае грамадства. Канфуцыянства. Індуізм. Фаталізм. Сінтаізм.*

## Раздзел II

## СУЧАСНАЕ ГРАМАДСТВА — ЦЭЛАСНЫ І ЎЗАЕМАЗВЯЗАНЫ СВЕТ

### Тэма 3. СУЧАСНЫ ЭТАП СУСВЕТНАГА ЦЫВІЛІЗАЦЫЙНАГА РАЗВІЦЦЯ І НАША ГРАМАДСТВА

### Сучасныя цывілізацыі

Разнастайнасць шляхоў і форм грамадскага развіцця. Сучасны этап цывілізацыйнага развіцця. Тыпы цывілізацый. Асаблівасці развіцця "традыцыйнага грамадства". Дасягненні і супярэчнасці, тупікі заходняй цывілізацыі. Пераход да постіндустрыяльнага грамадства. Цэласнасць і ўзаемазалежнасць сучаснага свету.

***Асноўныя паняцці.*** *Цывілізацыя. Тыпы цывілізацый. Традыцыйнае грамадства. Заходняя цывілізацыя. Постіндустрыяльнае грамадства. Цэласнасць свету.*

### Глабальныя праблемы сучаснасці

Паходжанне глабальных праблем і іх узаемасувязь. Навукова-тэхнічны прагрэс і глабальныя праблемы. Пагроза экалагічнага крызісу. Праблемы вайны і міру ў сучасных умовах. Узрастаючае адставанне краін "трэцяга свету" ад развітых дзяржаў. Шляхі вырашэння глабальных праблем. Новае палітычнае мысленне.

***Асноўныя паняцці.*** *Глабальныя праблемы сучаснасці. Экалагічны крызіс. Гонка ўзбраенняў. Наасфера. Новае палітычнае мысленне.*

## Тэма 4. ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ СУЧАСНАЙ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ

### Эканоміка і яе роля ў жыцці сучаснага грамадства

Залежнасць узроўню жыцця ад стану эканомікі. Сістэма эканамічных адносін. Вытворчасць. Адносіны ўласнасці. Разнастайнасць форм уласнасці. Размеркаванне, яго залежнасць ад форм уласнасці. Крыніцы даходаў розных груп насельніцтва.

***Асноўныя паняцці.*** *Эканоміка. Прыватная ўласнасць і яе формы. Акцыянернае таварыства. Дзяржаўная ўласнасць. Кааператыўная ўласнасць. Размеркавальныя адносіны.*

### Рынкавыя адносіны ў сучаснай эканоміцы

Паняцці рынку. Розныя варыянты арганізацыі эканамічнага жыцця. Роля рынку ў эканамічным жыцці. Закон вартасці. Закон попыту і прапановы. Рынкі тавараў, працы і капіталу. Канкурэнцыя і манаполія. Супярэчнасці рынкавай эканомікі. Рынкавы механізм і дзяржаўнае рэгуляванне. Роля грамадзянскага права, права на ўласнасць у рынкавых адносінах.

***Асноўныя паняцці.*** *Камандная эканоміка. Рынкавая эканоміка. Таварны рынак. Рынак капіталу. Рынак працы. Рынак інфармацыі. Біржа. Канкурэнцыя. Манаполія. Дзяржаўнае рэгуляванне рынку.*

### Навукова-тэхнічны прагрэс і матэрыяльная вытворчасць

Сутнасць навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. Новы этап НТР. Камп'ютэрная рэвалюцыя. Змяненне становішча чалавека ў працэсе вытворчасці. Уздзеянне НТР на розныя сферы дзейнасці.

***Асноўныя паняцці.*** *Навукова-тэхнічная рэвалюцыя. Камп'ютэрная рэвалюцыя. Чалавечы фактар вытворчасці. Інтэнсіфікацыя вытворчасці.*

### Чалавек у сістэме эканамічных адносін

Чалавек у сістэме адносін уласнасці. Змяненне ва ўмовах і змесце працы. Адносіны чалавека да працы. Размеркаванне па працы. Магчымасці павелічэння асабістага даходу. Патрэбнасці і спажыванне.

Georg-Eckert-Institut
für internationale
Schulbuchforschung
Braunschweig
-Schulbuchbibliothek-

***Асноўныя паняцці.*** *Адчужэнне. Гаспадарскія адносіны да справы. Прынцып размеркавання па працы. Культура спажывання.*

### Эканамічная рэформа ў рэспубліцы

Неабходнасць эканамічнай рэформы. Значэнне пераходу да рыначнай эканомікі. Умовы пераходу да рынку. Неабходнасць стварэння сістэмы сацыяльнай абароненасці. Шляхі стабілізацыі эканомікі.

***Асноўныя паняцці.*** *Эканамічная рэформа. Змешаная эканоміка. Рэгулюемая рынначная эканоміка. Кампенсацыя страт і індэксацыя даходаў. Механізм падтрымання занятасці. Стабілізацыя эканомікі.*

## *XI КЛАС*

*(34 гадзіны)*

## Раздзел II

## СУЧАСНАЕ ГРАМАДСТВА — ЦЭЛАСНЫ І ЎЗАЕМАЗВЯЗАНЫ СВЕТ (працяг)

### Тэма 5. ЦЫВІЛІЗАЦЫЯ І САЦЫЯЛЬНАЕ РАЗВІЦЦЁ

### Сацыяльная структура грамадства

Сацыяльная структура грамадства як сукупнасць узаемазвязаных і ўзаемадзеючых сацыяльных груп і сацыяльных інстытутаў. Разнавіднасці сацыяльных груп. Прычыны сацыяльна-структурных змяненняў. Роля сацыяльных перамяшчэнняў у жыцці грамадства.

***Асноўныя паняцці.*** *Сацыяльная структура грамадства. Сацыяльныя групы. Сацыяльныя інстытуты. Сацыяльныя перамяшчэнні.*

### Нацыі і нацыянальныя адносіны

Нацыя і яе прыметы. Развіццё нацый і нацыянальных адносін у сучасным свеце. Міжнацыянальная інтэграцыя, яе аб'ектыўныя прычыны. Этнічныя крызісы, іх асноўныя прычыны і шляхі пераадолення. Забеспячэнне правоў і свабод асобы — умова свабоды ўсяго народа.

*Асноўныя паняцці. Этнас. Этнічныя супольнасці. Нацыя. Нацыянальная дыферэнцыяцыя. Міжнацыянальная інтэграцыя. Нацыяналізм. Шавінізм.*

### Сацыяльны статус асобы

Сацыяльны статус асобы і сацыяльнай групы. Ацэнка грамадскай значнасці тых ці іншых сацыяльных пазіцый, якія займаюць людзі: аўтарытэт, прэстыж. Сацыяльная мабільнасць. Сацыяльная роля чалавека. Сацыяльныя гарантыі.

*Асноўныя паняцці. Сацыяльны статус асобы (прэстыж, аўтарытэт). Сацыяльныя ролі асобы. Сацыяльныя гарантыі.*

### Тэндэнцыі развіцця сацыяльных адносін у нашай краіне

Змяненні сацыяльнай структуры рэспублікі, якія адбываюцца ў цяперашні час. Праблемы сацыяльнай сферы нашага грамадства. Сацыяльная палітыка.

*Асноўныя паняцці. Сацыяльная сфера грамадства. Сацыяльная палітыка.*

## Т э м а 6. СУЧАСНАЯ ЦЫВІЛІЗАЦЫЯ І ПАЛІТЫЧНАЕ ЖЫЦЦЁ

### Роля палітычнай сістэмы ў жыцці грамадства

Палітычныя адносіны. Структура палітычнай сістэмы. Узаемасувязь арганізацый, палітычных норм і палітычнай культуры. Палітычны рэжым. Кіраванне грамадствам.

*Асноўныя паняцці. Палітычная ўлада. Палітыка. Дзяржава. Права. Палітычная партыя. Грамадска-палітычны рух. Аўтарытарызм. Таталітарызм. Дэмакратыя.*

### Прававая дзяржава

Вяршэнства закона — асноватворны прынцып прававой дзяржавы. Раўнапраўе грамадзян. Абарона правоў чалавека. Узаемная адказнасць дзяржавы і асобы. Раздзяленне ўлад.

*Асноўныя паняцці. Правы чалавека. Грамадзянін. Раздзяленне ўлад. Прэзідэнт. Прававая дзяржава. Грамадзянскае грамадства.*

### Палітычны плюралізм

Палітычны манапалізм і плюралізм. Прынцыпы палітычнага партнёрства. Формы вырашэння палітычных канфліктаў ва ўмовах прававой дзяржавы. Шматпартыйнасць.

***Асноўныя паняцці.*** *Плюралізм. Шматпартыйнасць. Кансенсус. Талерантнасць.*

### Парламенцкая дэмакратыя

Парламентарызм — класічная форма прадстаўнічай дэмакратыі. Дзейнасць парламенцкіх партый. Абарона правоў меншасці ў парламенце. Прынцып двайной адказнасці парламентарыяў. Прадстаўнічая і непасрэдная дэмакратыя.

***Асноўныя паняцці.*** *Парламент. Прадстаўнічая і непасрэдная дэмакратыя. Парламенцкая партыя.*

### Палітычны статус асобы

Разнастайнасць палітычных роляў асобы. Роля выбаршчыка. Выбарчая сістэма ў Рэспубліцы Беларусь. Крытэрыі ацэнкі перадвыбарнай праграмы кандыдатаў у дэпутаты. Палітычныя лідэры і імітатары. Палітычная культура.

***Асноўныя паняцці.*** *Палітычны статус. Прававы статус. Палітычны лідэр. Ахлакратыя. Папулізм. Палітычная культура.*

### Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь

Асновы канстытуцыйнага ладу.
Асоба, грамадства, дзяржава. Дзяржаўныя органы.

***Асноўныя паняцці.*** *Асноўны закон. Грамадзянства. Правы, свабоды і абавязкі асобы і грамадзяніна. Выбарчая сістэма. Рэферэндум. Заканадаўчая, выканаўчая і судовая ўлады.*

## Т э м а 7. ДУХОЎНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ СУЧАСНАЙ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ

### Духоўная культура

Паняцце культуры. Культура матэрыяльная і духоўная, іх узаемасувязь. Пераймальнасць і наватарства ў развіцці культуры. Разнастайнасць культур. Масавая і элітарная культура. Экранная культура. Узаемадзеянне культур.

*Асноўныя паняцці. Культура грамадства. Матэрыяльная і духоўная культура. Масавая і элітарная культура. Інтэрнацыянальная і нацыянальная культура. Дыялог культур. Культурная традыцыя.*

### Навука і адукацыя

Паняцце навукі. Адрозненне навуковага ведання ад звычайнага. Функцыі сучаснай навукі. Свабода творчасці і маральная адказнасць вучонага. Паняцце адукацыі. Дзяржаўнае рэгуляванне сістэмы адукацыі. Разнастайнасць тыпаў навучальных устаноў. Агульныя тэндэнцыі ў развіцці адукацыі.

*Асноўныя паняцці. Навука. Навуковыя веды. Светапогляд. Адукацыя. Гуманітарызацыя і гуманізацыя адукацыі.*

### Рэлігія ў сучасным свеце

Паняцце рэлігіі. Культ, рэлігійны светапогляд. Царква. Адрозненне звычайных уяўленняў веруючых ад багаслоўя. Аб'ядноўваючая і раз'ядноўваючая ролі рэлігіі ў сучасным свеце. Сусветныя рэлігіі. Верацярпімасць як адна з агульначалавечых каштоўнасцей.

*Асноўныя паняцці. Рэлігія. Рэлігійная свядомасць. Міласэрнасць. Маральныя запаведзі. Свабода сумлення. Верацярпімасць.*

### Духоўнае жыццё сучаснага чалавека

Чалавек — творца і носьбіт культуры. Агульначалавечая культура і асоба. Светапоглядныя арыенціры ў выбары духоўных каштоўнасцей. Роля літаратуры, мастацтва ў маральным і эстэтычным развіцці асобы. Крытэрыі духоўнасці чалавека. Бездухоўнасць: прычыны і вынікі, шляхі пераадолення.

*Асноўныя паняцці. Светапогляд. Духоўныя каштоўнасці. Духоўнасць і бездухоўнасць чалавека.*

### Праблемы развіцця духоўнай культуры ў Беларусі

Развіццё духоўнай культуры ва ўмовах абнаўлення грамадства. Вяртанне ў духоўнае жыццё рэспублікі культурнай спадчыны. Супярэчнасць паміж духоўным патэнцыялам нашага грамадства і магчымасцямі прылучэння да яго людзей.

Адраджэнне культуры — неабходная ўмова абнаўлення грамадства.

*Асноўныя паняцці. Культурная спадчына. Агульначалавечыя духоўныя каштоўнасці.*

## Тэма 8. ДАРОГА ДА НОВАЙ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ

### Інфармацыйнае грамадства

Паняцце інфармацыі. Інфармацыйнае грамадства. Перспектывы развіцця грамадства ў розных сферах, яго супярэчнасці. Роля сродкаў масавай інфармацыі ў жыцці грамадства.

*Асноўныя паняцці. Інфармацыя. Інфармацыйнае грамадства. Сродкі масавай інфармацыі.*

### Сацыяльныя прагнозы будучага развіцця

Сацыяльныя прагнозы і іх роля ў грамадска-палітычным развіцці. Навукова-тэхнічная рэвалюцыя і альтэрнатывы будучыні. Глабальныя праблемы і шляхі іх вырашэння. Прыярытэт агульначалавечых каштоўнасцей.

*Асноўныя паняцці. Сацыяльны прагноз. Навукова-тэхнічная рэвалюцыя. Глабальныя праблемы. Агульначалавечыя каштоўнасці.*

## ПАДАГУЛЬНЯЮЧАЕ ПАЎТАРЭННЕ

## ЗМЕСТ

### *I варыянт*

Тлумачальная запіска ........................................ 3
*VIII клас.* Свет і чалавек ........................................ 4
*IX клас.* Свет чалавека ........................................ 8
*X клас.* Чалавек і грамадства ........................ 12
*XI клас.* Чалавек і сучасная цывілізацыя ... 16

### *II варыянт*

Тлумачальная запіска ........................................ 21
*VIII клас*
Раздзел I. Чалавек, прырода, грамадства 22
*IX клас*
Раздзел II. Асоба. Мараль. Права ........ 25
*X клас*
Раздзел I. На шляху да сучаснай цывілізацыі ........................................................ 29
Раздзел II. Сучаснае грамадства — цэласны і ўзаемазвязаны свет ........................ 32
*XI клас*
Раздзел II. Сучаснае грамадства — цэласны і ўзаемазвязаны свет (працяг) .......... 34

Вучэбнае выданне

**Праграмы**
**курса для сярэдніх агульнаадукацыйных школ**
**і прафесійна-тэхнічных вучылішчаў**

**ЧАЛАВЕК І ГРАМАДСТВА**


Заг. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *І. Я. Лук'янчык*
Рэдактар *В. М. Захарэвіч*
Тэхнічны рэдактар *Л. П. Сопат*
Карэктар *Л. С. Зіза*
Камп'ютэрная вёрстка *А. М. Кісялёва*

Падпісана ў друк 02.06.97. Фармат $84 \times 108\ ^1/_{32}$. Папера газетная. Афсетны друк.
Ум. друк. арк. 2,1. Ул.-выд. арк. 2,0. Тыраж 5800 экз. Заказ 1526.

Навукова-метадычны цэнтр вучэбнай кнігі і сродкаў навучання Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь. Ліцэнзія ЛВ № 633. 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 3.

Аддрукавана з арыгінал-макета заказчыка ў Баранавіцкай узбуйненай друкарні
225320, г. Баранавічы, вул. Савецкая, 80.